***У кожнага народа спрадвеку вёўся свой каляндар, у якім з пакалення ў пакаленне перадаваліся мудрасць, веды, вопыт жыццёвых назіранняў. Мелі такі каляндар і беларусы. Багацейшы духоўны свет нашых продкаў, іх надзвычайны талент, яскравая фантазія, гумар адбіліся ў абрадах і звычаях, гульнях і песнях, прыкметах і павер`ях, якімі перасыпаны ледзь не кожны дзень гадавога кола. Абапіраючыся на бацькоўскія традыцыі і веру, беларускі працаўнік трымаў у памяці шматлікія парады і забароны, выказаныя вобразным трапным словам. Ён добра ведаў, калі можна весяліцца, а калі ўстрымлівацца ад забаў, калі можна брацца за тую ці іншую працу, а калі, наадварот, адкласці яе, каб не нашкодзіць сабе і блізкім.***

## Каляды (кат. 25 снежня, прав. 7 студзеня)

*Калі на Каляды прыгравае, быць зялёнаму году.*



Калядныя святы пачыналіся з дня Божага Нараджэння — Ражства. Калі першая зорка з'яўлялася на небе, уся сям'я садзілася за стол, засланы белым абрусам, пад які клалі сена. Стравы на стале былі посныя, абавязкова варылі куццю — кашу з круп. Запаліўшы свечку і памаліўшыся, пачыналі вячэраць. З гэтага дня па сяле хадзілі калядоўшчыкі — юнакі і дзяўчаты, пераапранутыя ў цыганоў, казу, жорава, кабылу. Калядоўшчыкі спявалі песні-калядкі, скакалі пад скрыпачку і бубен, у заключэнне выконвалі велічальную песню гаспадарам дома з самымі шчодрымі пажаданнямі, а ў адказ атрымлівалі пачастункі.

## Зімовыя святкі



Зімовыя святкі пачыналіся пасля поснай куцці (6 студзеня) і завяршаліся да Вадахрышча (19 студзеня). На гэтае свята адбываліся сапраўдныя тэатралізаваныя беларускія народныя карнавалы. Пачыналіся зімовыя святкі з Каляд (7 студзеня), якія былі ў гонар зімоваго сонцазвароту і каляднага месаеду пасля Пілiпаўскага посту. На гэты язычніцкі абрад наслаівалася хрысціянскае свята нараджэнне Хрыстова – свята Ражства. Неад'емным рытуалам з'яўляецца ўшанаванне продкаў-дзядоў. Гэтаму прысвячалі тры ўрачыста-шанавальныя куцці: перадкалядная посная, багатая – шчодрая і вадзяная. Гэтая дзея цягнулася ад 25 снежня да 6 студзеня.

## Вадохрышча (19 студзеня)

*"Святое Хрышчэнне і Калядам прашчэнне".*

У гэты дзень, згодна з праваслаўным календаром, святкавалася хрышчэнне Ісуса Хрыста, асвячалася вада. Народ верыў у цудадзейную сілу такой вады і выкарыстоўваў пры розных бытавых выпадках і здарэннях: яе давалі выпіць хвораму, ёю апрысквалі новую хату перад тым, як засяліцца, і вуллі, каб лепш вяліся пчолы. Хрышчэнскай вадою асвячалі поле перад сяўбою. Дзе-нідзе ў гэты дзень дазвалялася выконваць некаторыя сялянскія работы, забароненыя на працягу ўсіх Каляд. На Вадохрышча прыпадалі самыя вялікія маразы, пасля якіх зіма паступова паварочвалася на лета. У народзе казалі: "Трэшчы не трэшчы, прайшлі Вадахрэшчы - не к Ражству, а к Пятру", маўляў, больш маразоў ўжо не будзе.



Вадохрышча было днём, па якім арыентаваліся ў вызначэнні будучага надвор`я ("На Вадохрышчы вельмі сцюдзёна - у жніво вельмі горача"), спрабавалі прадказаць і якасць будучага ўраджаю ("На Вадохрышча дзень цёплы - будзе хлеб цёмны").

## Грамніцы, альбо Стрэчанне (кат. 2 лютага, прав. 15 лютага)

*Грамніцы — палавіна зіміцы.*



Свята сустрэчы зімы і лета. Якое надвор’е на Грамніцы, такая будзе і вясна. Пасля гэтага дня пачыналі рыхтавацца да работ у полі. У царкве ці касцёле асвячалі грамнічныя свечкі. Яны лічыліся ахоўнымі — гаспадар з дапамогай гэтых свечак «асвячаў» хату і ўсю гаспадарку, выпальваючы імі невялікія крыжыкі на дзвярах і варотах. Верылі, што грамнічныя свечкі ратуюць будовы ад удару маланкі. З грамнічнымі свечкамі тройчы абыходзілі свойскую жывёлу на свята Юр'я, іх запальвалі на засеўкі, з імі абыходзілі хаты на Іллю і Багача, сустракалі маладых на вяселлі, дзіцятка на радзінах, клалі ў руку нябожчыку, ішлі шукаць папараць-кветку на Купалле.

## Сырны тыдзень, або Масленка (за 8 тыдняў да Вялікадня)

*Масленка, масленка, нясі сыру, масла нам, каб зімачка згасла!*




Старажытнае язычніцкае свята. У гэты тыдзень праводзяць зіму. Сёння Сырны тыдзень болей вядомы як Масленка. Шмат стагоддзяў у беларусаў сыр быў самым папулярным прадуктам і сімвалізаваў нараджэнне новага жыцця. У гэты тыдзень дзяўчаты і хлопцы ладзілі гушканне на арэлях, коўзанне з горак на санках. Верылі, што чым вышэй узляціш на арэлях, чым далей скоцішся з горкі — тым даўжэйшы будзе лён. На Масленку ласуюцца блінамі, спяваюць масленічныя песні.

## Гуканне вясны (з 14 сакавіка)

*Благаславі, Божа, вясну заклікаці, лета сустракаці!*



Першае вясновае свята. Дзяўчаты збіраліся на ўзгорках (каб было бліжэй да неба) і спявалі вяснянкі — песні, у якіх клікалі вясну. Вадзілі карагоды, спальвалі пудзіла зімы, як на Масленку. Падчас спеваў вяснянак і гукальных карагодаў дзяўчаты падкідвалі ўверх печыва ў выглядзе птушак — жаўрукоў, кулікоў, буслоў, што павінна было, як і спевы, хутчэй выклікаць надыход вясны.

## Саракі



22 сакавіка, дзень, як зараз кажуць, "вясенняга раўнадзенсва". Гэты дзень лічыўся нараджэннем новага года, пачаткам абуджэння зямлі ад зімовага сну. Некалькі назваў мае ён. Найбольш распаўсюджаны - "**саракі**". Сення існуе некалькі тлумачэнняў, чаму менавіта так. Найбольш верагодным можна лічыць тлумачэнне, звязанае з коранем "рок" (год) - пачатак новага году. Акрамя таго, з гэтага дня пачыналі адлічваць яшчэ 40 дзен, адмечаных маразамі па начах, па заканчэнні якіх можна было пачынаць сеяць - адну з самых важных сельскагаспадарчых спраў на увесь год. Кліматычные ўмовы не дазвалялі памыліцца, пасееш рана - вымерзне, позна - высахне, і можна застацца без збожжа зімой, што было раўнаважна смерці. Таму так уважліва адносіліся нашые продкі да гэтага дню.

## Камаедзіца

Беларускае народнае свята, звязанае з сустрэчай вясны, лічыцца праявай татэмізму. Уключае ў сябе шэсце пераапранутых з удзелам мядзведзя і святочны абед, імітуюцца звычкі жывёлы. Святкуецца 24 сакавіка перад Дабравешчаннем. Назва свята паходзіць ад *камоў* (літаральна: есці камы) — сушаны рэпнік, аўсяны кісель, якія лічыліся ласункам лясной істоты.



## Дабравешчанне, або Звеставанне (кат. 25 сакавіка, прав. 6 красавіка)

*На Дабравешчанне дзеўка касу не пляце, а птушка гнязда не ўе.*



Нашы продкі лічылі, што ў гэты дзень прыходзіць вясна. Гэта свята прылёту бусла і ластаўкі. Шчасціла таму, хто ўбачыць першага бусла, які ляціць, а не стаіць. Гаспадыня падымалася раней мужа, каб выканаць абрад «развязвання сахі». Пасля абеду "гукалі вясну". Дзяўчаты збіраліся ля гумнаў і лазняў, забіраліся нават на стрэхі і спявалі вяснянкі. Разводзілі невялікія вогнішчы, вадзілі вакол іх «танкі» (карагоды). Гаспадыні пяклі печыва ў выглядзе птушак. У гэты дзень не дазвалялася працаваць.

## Вербніца (апошняя перад Вялікаднем нядзеля)

У гэты святочны дзень у царкве ці касцёле асвячалі галінкі вярбы, неслі іх дадому і злёгку сцябалі імі дамашніх, перш за ўсё дзетак, і прыгаворвалі:



*Не я б'ю, вярба б'е,*
*За тыдзень — Вялікдзень.*
*Будзь здароў, як вада,*
*А расці, як вярба!*
*Будзь здароў на ўвесь год!*

Людзі верылі, што такім чынам чалавеку перадаецца моц і прыгажосць гэтага дрэва. Частку асвечаных галінак клалі за бажніцу, утыкалі ў сцены, вокны. На працягу ўсяго года асвячоныя галінкі вярбы выкарыстоўваліся: кожная гаспадыня выганяла на Юр'я сваю карову на пашу, злёгку сцябаючы па баках галінкай, з вербачкай селянін выходзіў засяваць поле, садзіць бульбу.

Вярбная галінка была патрэбная падчас першага грому. Каб не баяцца навальніцы, імкнуліся з'есці па адной пупышцы, а затым легчы на зямлю і перакуліцца. Пачуўшы грымоты, гаспадыня запальвала грамнічную свечку, а вербныя галінкі клала на падаконнік з таго боку, адкуль насоўваліся дажджавыя хмары.

Галінкі ніколі не выкідалі, а захоўвалі да наступнай Вербніцы, каб спаліць у печы і попел рассыпаць па градках.

## Вялікдзень



Гэтае свята лічыцца найвялікшым каляндарным святам. Яно складае выключную адметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочнага каляндара.На гэта свята сутракалі Новы Год па сонечнаму календару. Святкавалася ў дзень вяснавога раўнадзенства. Потым стала перасоўным ад 4 красавіка да 8 мая. Апошняя нядзеля перад святам была Вербная нядзеля. У царкву заносілі галінкі вярбы, якія асвяшчалі святой вадой. Потым прынасілі дамоў і з'ядалі па аднаму пухірку, каб абараніцца ад маланкі, а рэшткі вярбы захоўвалі да наступнай Вербніцы.

## Наўскі Вялікдзень

Адзначаўся ў чысты чацвер, як частка агульнакаляндарнай традыцыі ўшанавання дзядоў. Гэтае свята больш вядома пад назвай Радауніца(*Наві Дзень* паходзіць ад старажытна-славянскага *навь* – нябожчык. , *Рада*) – дзень памінаньня памерлых ва ўсходніх славянаў, на які са старажытных часоў адбываліся трапэзы на магілах бацькоў і блізкіх сваякоў. Назва

Праваслаўная Царква ўключыла Радаўніцу ў свой культ.




Радаўніца адзначаецца праз тыдзень пасля Вялікадня, заўжды на аўторак. Спачатку ідуць памінаць блізкіх у царкву, а потым на могілкі. І хоць існуе звычай памінальнай трапэзы, у тым ліку велікоднае яйка пакідаць «для спачылых», Праваслаўная Царква не ўхваляе гэтага звычаю, паколькі лічыцца, што памерлым патрэбна толькі малітва аб упакаеньні душы і добрыя справы ў памяць пра іх.

## Юр'я

6 мая Георгія Пераможцы Ярылы. Варыянты назваў свята, прысвечанага гэтаму боству— Ярылавіца, Ярылкі. Веснавы Юрай

знаменаваў сабою сапраўдны пачатак вясны. Менавіта з гэтага дня, як лічылі амаль усюды, пачынае кукаваць зязюля. На Юр'е сяляне выходзілі з песнямі і ахвярнымі стравамі аглядаць свае зарунелыя палеткі. З Юр'ем звязваўся, як правіла, і першы выпас жывёлы. Адначасна з апякунствам свойскай жывёлы Юр'я лічыўся валадаром ваўкоў. У народзе ўяўлялі, што Юр'я едзе на белым кані і замыкае пашчы дзікім звярам, пасля чаго тыя менш нападаюць на скаціну. Свята было напоўнена шматлікімі абрадавымі дзеяннямі, песнямі, павер'ямі, прыкметамі апатрапеічнага і заклінальнага характару. Юр'я – традыцыйнае свята, якое адзначаецца (23 красавіка па старым стылі). Гэта адно з найбольш адметных святаў земляробчага календара, абстаўлена шэрагам урачыстых абрадавых дзеянняў. Свята адзначаецца ў гонар Св. – заступніка свойскай жывёлы і сялянскай нівы. У хрысціянскія часы ён пераняў рысы і функцыі язычніцкага бога



## Зялёныя святкі або Сёмуха

Свята найвышэйшага росквіту прыроды. Вядома пад назвай Сёмухі, Тройцы. Святкуецца гэтае свята на семым і восьмым тыдні пасля Вялікадня. Гэтае свята з'яўляецца гімнам маці-прыродзе, сімвалізуе ўласцівае канцу вясны і пачатку лета ўшанаванне зеляніны, дрэў і кветак, што знаходзяцца ў сваім росквіце. Яны – прыроднае атачэнне свята, яго вобразнасць і змест.



Некалі даўно маладыя дзяўчаты з песнямі хадзілі ў лес. Абіралі там маладыя бярозкі і завівалі паміж сабой стужачкамі, каб атрымаліся такія ўпрыгожаныя вароцікі. Пасля праз іх праходзілі. Даследчыкі кажуць, што гэта такі архаічны сімвал таго, што жанчына ўступае ў шлюбны ўзрост і тым яднаецца з прыродай, паказвае сусвету, што яна ўжо гатовая пайсці замуж і нараджаць дзетак.

## Алёна (Алёна, Ульяна – 3 чэрвеня)



Дзень ільну. Лічылася, як пасеяць лён на Алёну (Ульяніцу), то добры "удасца". Народныя звычаі і традыцыі добра сумясціліся з імем Алёны, якое даў гэтаму дню царкоўны каляндар. Маці рымскага імператара Канстанціна, які ў 323 годзе аб'явіў хрысціянскую веру пануючай па ўсім валадарстве, прызначана разам з сынам Роўнаапостальнай за заслугі, што прыраўнены да дзеянняў Хрыстовых апосталаў. Яна ў 326 годзе знайшла крыж Гасподні, а таксама рэшткі трох вяшчуноў, што абвясцілі аб святым вялікім нараджэнні, і здзейсніла шмат іншых гістарычных хрысціянскіх учынкаў.

## Купалле

У разгар лета ў Беларусі адзначаюць Купалле – адно з найстарадаўнейшых народных свят, прысвечаных сонцу і росквіту зямлі. Гэтае свята насычана прыгожымі язычніцкімі звычаямі. Сутнасць гэтага свята засталася некранутай да нашых дзён. Увасабленнем былі ачышчальныя вогнішчы, ачалавечаны вобраз жанчыны Купалы і нават яго дочкі. Сёння згодна з праваслаўным календаром свята адзначаюць у ноч з 6 на 7 ліпеня, каталіцкім – 24 чэрвеня.



З Купаллем звязана шмат дзіўных легенд і паданняў. У народзе верылі, што ў гэту ноч рэкі свяцяцца асаблівым нерэальным святлом, а ў іх водах купаюцца душы памерлых у абліччы русалак. Па зямлі ходзяць ведзьмы, чарадзеі і духі, якія імкнуцца нашкодзіць чалавеку, расліны і жывёлы размаўляюць, а сонца на золку "гуляе".

Убачыць гэтыя цуды, зразумець мову звяроў і птушак можна з дапамогай кветкі папараці, якая зацвітае, згодна з павер'ямі, усяго на імгненне раз у год. Яна давала незвычайную здольнасць бачыць будучыню і знаходзіць усе схаваныя скарбы свету, але раздабыць яе мог толькі вельмі смелы чалавек. Пошук "папараць-кветкі" – адзін з самых таямнічых рытуалаў купальскай ночы.

**Пятро. Пятроў дзень, Пятро-Павел, Пятрок, Паўлюк, Павел, Пятра(12 ліпеня)**

Старадаўняе земляробчае свята, па сутнасці завяршэнне Купалля. Селянін заўважаў: "Святы Пятро - у жыце ядро", "Пятрок у касу звоніць", "Калі высыплецца ячмень, зязюля падавіцца зернем і больш не кукуе". Вядома, што зязюля куе ад Магдалены два Пятра ці Купалы, калі і заканчваюцца гулянні моладзі.

Дзяўчаты хадзілі ў лес "развіваць вянкі", якія былі "завіты" імі на Сёмуху, "кумаваліся" (выбіралі сяброўку на год). Палілі кастры, елі абрадавыя стравы, гушкаліся на арэлях, спявалі пятроўскія песні.

Лічылася, што пасля Пятра лета ідзе на спад. "Прыйшоў Пятрок - апаў лісток", "Пётр і Павел на гадзіну дзень убавіў, Ілля-прарок два ўвалок". Заканчваўся Пятроў пост.

Пра Пятра і Паўла таксама хадзіла нямала легенд і казак, у якіх святыя



паказваюцца ў выглядзе простых сялян. Гэта гаворыць аб папулярнасці першавярхоўных апосталаў, якія не былі звязаны адзін з адным у жыцці, але
былі пакараны смерцю ў адзін дзень, як самаадданыя праведнікі Хрыста па
загаду імператара Нерона каля 67 года. На хрысціянскіх абразах іх часта
паказваюць разам, а ў народным календары яны наогул зліліся ў адзін вобраз.

**Ілля (Галляш 2 жніўня).**

Апякун земляробства і абаронца ад нячыстай сілы, які ўвабраў у сябе рысы язычніцкага бога Перуна. Свята дажджоў і навальніц. Успрымацца як канец лета і пачатак восені: "Прыйшоў Пятрок - сарваў лісток, прыйшоў Ілля - сарваў два", "Ілля нарабіў гнілля", "На Іллю да абеда лета, а пасля абеда восень", "Ілля ваюе з чартамі, іх б'е перунамі", "Ілля пытае, ці гатова ралля, а Успенне, ці гатова насенне", "На святога Галляша з новых круп каша".

Заканчвалі касавіцу, хадзілі талакою касіць удовам. Праводзілі зажынкі - свята пачатку жніва. Часта ўспамінацца Ілля ў песнях, якія спяваліся на Калядны.

Жнівеньскія ліўні з бясконцымі маланкамі празвалі "рабінавымі днямі

(начамі)", якія часцей пачыналіся на Іллю. Існуе павер'е ў народзе аб громе.



Грыміць таму, што Ілля (Пярун) грукаціць на калясніцы па хмарах і кідае маланкі-стрэлы ў нячыстую сілу, якая можа ператварацца ў розных звяроў, каб выратавацца. У прыродзе сапраўды пасля сонцастаяння (Купалы, Пятра) назіраюцца змены надвор'я як перамога Іллі над Пятром. З гэтымі міфамі, мусіць, і звязана даўняя завядзёнка паляўнічых пачынаць адстрэл звяроў.

Народнае ўяўленне, што праяўляецца ў свяце Іллі, цесна звязана з біблейскай гісторыяй аб прароку Іллі, які нарадзіўся ў Фесвіі Галаадскай яшчэ за 900 год да хрысціянства. Ілля (у перакладзе з яўрэйскага "апора Божая") перад паганскімі жрацамі і ізраільскім народам, які перастаў верыць у Адзінага і ад таго тры гады была засуха, запаліў агнём з неба мокры ахвяравальнік, што не змаглі зрабіць жрацы са сваімі багамі. Пасля гэтага язычнікі ўверавалі ў адзінага Бога, жрацы былі забіты, а народ пасля малітвы прарока атрымаў доўгачаканы і жыццядайны дождж. За гэты і іншыя цуды Ілля па Божай волі ўзляцеў на неба на вогненнай калясніцы. Гэты факт, як мяркуюць даследчыкі, дапамог вобразу атрымаць адпаведныя рысы язычніцкага грамаўніка (не толькі Перуна, але і Зеўса).

## Дажынкі

Дажынкі беларусаў, звязанае з апошнімі момантамі жніва. Суправаджалася народнымі абрадамі,танцамі, песнямі, чым былі ўдзячныя «духам нівы» за хлеб і заадно прасілі даць урадлівасць і налета. – старажытнае народнае свята ў



Дажаўшы жыта, пасля абраду «завівання барады» (закручвалі пук і пакідалі яго) «для птушак» жнеі прыхарошвалі сноп кветкамі, плялі вянкі з каласоў і з песнямі ішлі ў вёску. Прыйшоўшы, аддавалі сноп гаспадарам, за што мелі смачны пачастунак ці падарункі.

Дажынкам было прысвечана шмат дажынкавых песень, якія спявалі напрыканцы жніва, вяртаючыся з поля ў вёску і на застоллі. Яны былі значна весялейшыя за жніўныя песні, бо ў апошніх спявалася пра нялёгкую працу і долю жней і іх дзяцей.

У наш час дажынкі адзначаюць як свята ўраджаю.

## Пакровы

*«Святы Пакроў накрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам», «...рыбу луской, дрэва карой, птаху пяром, дзеўку чапцом»; «Святэй Пакроў стагі пакрыў: першы стажок дранічкамі, другі стажок саломкаю, трэці стажок белым снегам».*



Гаварылі, што зіма закрывае лета, а Бог пячатае зямлю пасля Пакрова, і да вясны ніхто не можа знайсці скарбаў. Адзначаліся ад 14 кастрычніка да 27 кастрычніка. На гэтае свята размярковываліся дні паміж дзяўчатамі, а 27 кастрычніка па надвор'ю меркавалі аб характары будучай жонкі, і называлі гэты час Дзівочым летам. Пачынаючы з гэтага свята, моладзь пачынала збірацца на вячоркі, а хатнія справы спраўляліся з песнямі.

## Дзяды



Дзяды – народнага календара, звязанае з памінаннем продкаў («дзядоў»). У славянскай міфалогіі «дзядамі» таксама называюць душы продкаў. У Беларусі Дзяды адзначаюцца некалькі разоў на год: масленічныя, радаўніцкія, траецкія (духаўскія), пятроўскія, змітраўскія. Галоўныя – Восеньскія Дзяды (Змітраўскія, Вялікія, Асяніны, Тоўстая вячэра, Хаўтуры), яны адзначаюцца ў лістападзе, але ў розных рэгіёнах у розныя дні (Міхайлаўскія Дзяды, Піліпаўскія Дзяды, Змітраўскія Дзяды і інш.). свята беларускага

У цэнтры абраду – вячэра ў памяць памерлых сваякоў. Рытуал Дзяды у найбольш архаічнай форме захаваўся толькі ў беларусаў. Кожны дзень тыдня меў сваё значэнне. Так субота мела быць днём ушанавання дзядоў, усіх памерлых. У гэты дзень кожны павінен быў успомніць лепшыя рысы прашчураў, аддаць ім належную павагу.

## Мікола Зімовы (Міколы, Мікольшчына 19 снежня).

Багата адлюстраваны ў прымаўках: "Без Міколы не бывае ні зімы, ні лета", "Хвалі зіму на Міколе", "Да Міколы няма зімы ніколі".

Як і многія святы і прысвяткі ў гонар гістарычных асоб, і гэты дзень, што прызначаны свяціцелю Мікалаю, архіепіскапу Мір Лікійскіх, цудатворцу, сваім зместам не адлюстроўвае ні біяграфію, ні жыццёвых подзвігаў гэтага вядомага не толькі ў хрысціянскім свеце чалавека, які жыў у другой палове III стагоддзя ў Малой азіі.



**Паважаныя сябры, у наступных кнігах размешчаны больш падрабязыя матэрыялы аб народных святах беларусаў. Кнігі знаходзяцца ў фондзе дзіцячай бібліятэкі-філіяла**




**Восеньскія святы : Дапаможнік для настаўнікаў і выхавальнікаў / Уклад. А. Ю. Лозка; Маст. А. У. Рудая. — Мінск : Беларусь, 1995. — 110 с. : іл.**

Дапаможнік уводзіць у навучальны і выхаваўчы працэс зачаткі беларускай народнай педагогікі. Тут змешчаны метадычныя рэкамендацыі, сцэнарыі, іншыя матэрыялы для вывучэнны і правядзення восеньскіх святаў і прысвяткаў беларускага народнага календара.




**Дзень за днём : Прыкметы надвор’я : народны каляндар-месяцаслоў з гараскопам / Сабраў і апрацаваў Аркадзь Русецкі; маст. В. Мікіта. — Мінск : Маст. літ., 2008. — 302 с., іл.**

Гэта кніга народнай мудрасці. У ёй змешчаны прымаўкі пра кожную пару года, прыкметы надвор’я, а таксама народны каляндар-месяцаслоў, у якім размова ідзе пра кожны дзень года: якое народнае ці царкоўнае свята выпадае на гэты дзень і якія абрады трэба выконваць, што прадказвае надвор’е ў гэты дзень і г. д. Кнігу дапаўняе невялічкі гараскоп, які дае характарыстыкі асобам, народжаным у кожны з дзён года.




**Зімовыя святы : Дапаможнік для настаўнікаў і выхавальнікаў / Аўт.-уклад. А. М. Аляхновіч, А.Ю. Лозка; Маст. М. У. Анемпадыстаў . — Мінск : Беларусь, 1999. — 159 с : іл. — (Бібліятэчка народных святаў і прысвяткаў)**

У дапаможніку змешчаны рэкамендацыі, сцэнарыі, гульні, песні і іншыя матэрыялы для вывучэння і правядзення зімовых святаў і прысвяткаў беларускага народнага календара. Асаблівае месца адводзіцца асноўнаму зімоваму святу — Калядам.




**Катовіч, А., Крук, Я. Зімовыя святы. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 119 с — (Беларускі народны каляндар).**

У кнізе змешчаны метадычныя рэкамендацыі, сцэнарыі, іншыя матэрыялы для вывучэнны і правядзення зімовых святаў беларускага народнага календара.




**Макарцоў, М. Ф. Беларусь святкуе : Сцэнарыі народных святаў і арадаў / Мікола Макарцоў. — Мінск : “Чатыры чвэрці”. 2000 — 132 с., з іл.**

Прадстаўленыя ў зборніку сцэнарыі народных свят і абрадаў аўтар ствараў выкарыстоўваючы сабраныя ім узоры фальклору і творы класікаў беларускай літаратуры.




**Піскун, Я. У. Каляндарна-абрадавыя святы : Каляда,Масленіца, Купалле, Дзяды / Аўтар-складальнік Я. У. Піскун — Мазыр : РВФ "Белы вецер", 1999. — 51 с.**

У выданні даюцца рэкамендацыі па арганізацыі і правядзенні ранішнікаў у пачатковай школе, прысвечаных каляндарна-абрадавым святам.




**Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М. А. Козенка і інш. — Мінск : Бел.навука, 2001. — 797 с.**

Том прысвечаны рэгіёну Магілёўскага Падняпроўя. І дае ўяўленне аб адметных асаблівасцях мясцовай традыцыйнай культуры: абрадах, песнях, гульнях фальклоры. Том багата ілюстраваны фатаграфічнымі, нотнымі матэрыяламі.